# ВОДЗЫЎ

на аўтарэферат дысертацыі А.А. Карп “Беларуская літаратурная крытыка першай трэці XX стагоддзя: эстэтычны дыскурс”
на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук
па спецыяльнасці 10.01.08 – тэорыя літаратуры. Тэксталогія

Актуальнасць тэмы. Канцэптуальнае даследаванне беларускай літаратурнай крытыкі сёння надзвычай запатрабавана ў адукацыйным працэсе не толькі на ўзроўні вышэйшай, але і на ўзроўні сярэдняй адукацыі. Дзеючыя вучэбныя праграмы па вучэбным прадмеце “Беларуская літаратура” для ўстаноў, якія забяспечваюць атрыманне сярэдняй адукацыі, прадугледжваюць найперш навучанне гісторыі і тэорыі літаратуры. Хоць вучэбныя дапаможнікі для пэўных класаў і ўтрымліваюць азнаямляльныя ўрыўкі з літаратурна-крытычных прац, але пра комплекснае ўяўленне пра літаратурны працэс, які, натуральна, уключае літаратурную крытыку, пакуль гаворка не ідзе. Пры распрацоўцы новай лінейкі дапаможнікаў для вучняў аўтарам-складальнікам гранічна важна мець на ўвазе пэўны эстэтычны канон, якога прытрымлівалася літаратурная грамадскасць у канкрэтны гістарычны перыяд, каб арганізаваць сістэмную працу па навучанні літаратуры і працягваць яе на наступных ступенях адукацыі.

Навукова-метадалагічная значнасць прадстаўленай у аўтарэфераце дысертацыйнай працы абумоўлена паспяховым вырашэннем у ёй гісторыка-літаратурных, тэксталагічных, тэарэтычных задач, удалай спробай распрацоўкі метадалагічнага інструментарыя для дыскурс-аналізу і крытэрыяльнай матрыцы для дэскрыпцыі літаратурнай крытыкі вызначанага перыяду. Важным вынікам работы стала ўдакладненне месца літаратурна-крытычнай спадчыны А. Бабарэкі, В. Ластоўскага, А. Луцкевіча, С. Палуяна, Я. Пушчы, У. Чаржынскага ў кантэкце тагачаснага літпрацэсу, увядзенне ў сённяшні навуковы дыскурс прац малавядомых крытыкаў, асэнсаванне медыяпалемікі пачатку XX стагоддзя па пытаннях эстэтычнага ў літаратуры з сучасных пазіцый. Неабходна адзначыць тэхнічную дакладнасць выканання працы: навізна думкі суправаждаецца аб’ектыўнасцю і незаангажаванасцю ацэнак, доказнасцю, увагай да дэталяў.

Практычнае прымяненне атрыманых вынікаў. Распачатая работа па фундаментальным даследаванні тэкстаў літаратурнай крытыкі можа стаць трывалым падмуркам для далейшых распрацовак у гэтым кірунку і асновай для працягу навуковай традыцыі, закладзенай М. Мушынскім.

Ва ўмовах арыентацыі адукацыйнага працэсу на прынцыпы функцыянальнай адукаванасці вучня вынікі дысертацыйнай работы А. А. Карп будуць запатрабаваныя навукова-метадычнай практыкай, у якой крытычнае мысленне і здольнасць да асэнсаванай ацэнкі з’яў рэчаіснасці разглядаюцца як ключавыя кампетэнцыі. Сістэмны разгляд літаратурна-крытычнай дзейнасці даследаваных дысертантам аўтараў у навучальным працэсе паспрыяе рэалізацыі названых кампетэнцый.

Стылістычнае афармленне. Падчас знаёмства з аўтарэфератам прыцягвае ўвагу стылістычная чысціня тэксту, дакладнасць ужывання тэрміналогіі, узважаны адбор лексікі, што ўказвае не толькі на пісьменнасць, але на шырокую навуковую эрудыцыю аўтара. Пры гэтым у назве раздзела 1.1 "Станаўленне і эвалюцыя крытычнай думкі газеты…" (с. 7) назіраецца пэўная двухсэнсоўнасць, бо газета наўрад ці здольная самастойна думаць.

Тэма работы вымагала ад даследчыцы заглыблення ў маладаследаваныя пласты крытыкі мінулага стагоддзя, чым і цікавая. Поўны тэкст дысертацыі хацелася б пабачыць у выглядзе манаграфіі ў менш абагуленым выглядзе, чым гэта прадстаўлена ў аўтарэфераце.

Такім чынам, мяркуючы па аўтарэфераце, дысертацыя А.А. Карп "Беларуская літаратурная крытыка першай трэці ХХ стагоддзя: эстэтычны дыскурс" з'яўляецца завершаным сур'ёзным і арыгінальным даследаваннем, у якім на высокім навуковым узроўні прапануецца вырашэнне пастаўленых задач. У сувязі са сказаным лічу, што аўтар працы заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.01.08 – тэорыя літаратуры. Тэксталогія.

Вядучы навуковы супрацоўнік
лабараторыі гуманітарнай адукацыі
навукова-даследчага цэнтра
НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
кандыдат філалагічных навук дацэнт І.Д. Воюш

Подпись И.Д. Воюш удостоверяю А.С. ВАЩЫ
Начальнык ОК и ПР 16.02.2023

Водгук паступіў у савет па абароне дысертацый 17.02.2023 г.
сакратар савета Богдан А.І.

З водгукам азнаёмлена. 17.02.2023 г. А. Карп (А.А. Карп)